**Міхалевіч, Н.** Каб пакінуць добры след на зямлі / Н. Міхалевіч // Витебские вести. – 2017. – 15 апр. – С. 12.

## КАБ ПАКІНУЦЬ ДОБРЫ СЛЕД НА ЗЯМЛІ

*27 гадоў прайшло пасля падзей, якія дзесяцігоддзе трымалі ў напружанні тых, хто адпраўляўся на тэрміновую службу, і тых, хто выбраў сваёй прафесіяй абараняць Радзіму. Увесь гэты час успамінаюць тых, хто не вярнуўся з той вайны.*

Далёкі Афганістан у чарговы раз даказаў мужнасць і стойкасць нашых салдат і афіцэраў, якія змагаліся ў імя інтэрнацыянальнай ідэі і да апошняга верылі ў правату сваёй місіі. Рэха таго часу не змоўкне, пакуль жывуць такія людзі, як Валянцін Андрыеўскі, старшыня Докшыцкай раённай арганізацыі грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

### ПЕРШЫ Ў СТРАІ

Вайна для хлопца з Докшыц пачалася ў 1979 годзе. Валянцін Андрыеўскі – салдат 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі, якая першай ступіла на афганскую зямлю, быў сярод лепшых. Вынослівы, моцна загартаваны, рашучы юнак з дзяцінства бачыў сябе пад купалам парашута ў блакітным небе і рыхтаваў сябе да гэтага. А таму ўсё, што было ў яго жыцці пасля, не стала нечаканасцю. У Казахстане, дзе прызямліўся самалёт з салдатамі-дэсантнікамі на дазапраўку, прыйшло разуменне: ідуць у Афган. Кундуз, Герат, Джалалабад – гарады, назвы якіх не выкінеш з памяці, калі б нават захацеў. Да цяперашняга помняцца дарогі і сцежкі да цяснін, гор, кішлакоў... Валянцін Андрыеўскі быў батальённым разведчыкам, а значыць, ішоў наперадзе ўсіх.

За праяўленыя мужнасць, кемлівасць і воінскую доблесць ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, а ў 1983 годзе – Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

### УСЁ ЗАСТАЕЦЦА ЛЮДЗЯМ

Валянцін Станіслававіч – чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Задуманае ажыццяўляе дзякуючы сумесным намаганням выканаўчай улады, ваеннага камісарыята, саюза афіцэраў, БРСМ і іншых структур. Згодна з такім прынцыпам працуе і аб’ядноўвае вакол сябе людзей. Невыпадкова Докшыцкая грамадская арганізацыя знаходзіцца ў дзясятцы лепшых у вобласці.

Не кожны раён можа пахваліцца паркам Воінскай Славы, які ствараецца ў Докшыцах. Помнік ветэранам баявых дзеянняў (манумент у выглядзе жанчын, якія схілілі галовы ў трывозе за сваіх сыноў) пры садзейнічанні райвыканкама, ваеннага камісарыята і актыўным удзеле савета арганізацыі быў адкрыты ў 2012 годзе.

Пасля візіту на прыём да старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Андрэйчанкі ў парку, а затым і ў аграгарадку Бягомль з’явіўся сімвал афганскай вайны – машына БМД.

Ніводнае патрыятычнае мерапрыемства ў раёне цяпер не праходзіць без наведвання парку Воінскай Славы.

Традыцыйнымі сталі сустрэчы воінаў-«афганцаў» з навучэнцамі. Праходзяць яны ў школах у цёплай сяброўскай абстаноўцы. Інтэрнацыяналістам ёсць што расказаць, а школьнікам – чаму павучыцца. Арганізацыяй такіх сустрэч займаецца Валянцін Андрыеўскі. Знаходзіць на гэта час,

нягледзячы на тое, што поўнасцю аддаецца рабоце, якой прысвяціў 36 гадоў жыц-ця. Валянцін Станіслававіч – вадзіцель хуткай дапамогі ЦРБ. Кіраўніцтва характарызуе яго як добрасумленнага супрацоўніка, адзначае дабрыню, спагадлівасць, тактоўнасць.

Не так даўно Валянцін Андрыеўскі атрымаў чарговую грамату: за ўклад у патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення адзначаны Федэрацыяй прафсаюза Беларусі.

– Усё зробленае застаецца людзям, – гаворыць актывіст грамадскага аб’яднання. – Не шкада ні часу, ні сіл дзеля таго, хаб пакінуць пасля сябе добры спед на зямлі. Іначай жыць нельга.

*Нэлі* ***МІХАЛЕВІЧ***